22100027

International Baccalaureate®
Baccalauréat International
Bachillerato Internacional

**BELARUSIAN A1 – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A1 – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A1 – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Thursday 13 May 2010 (afternoon)
Jeudi 13 mai 2010 (après-midi)
Jueves 13 de mayo de 2010 (tarde)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

---

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a commentary on one passage only. It is not compulsory for you to respond directly to the guiding questions provided. However, you may use them if you wish.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez un commentaire sur un seul des passages. Le commentaire ne doit pas nécessairement répondre aux questions d'orientation fournies. Vous pouvez toutefois les utiliser si vous le désirez.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un comentario sobre un solo fragmento. No es obligatorio responder directamente a las preguntas que se ofrecen a modo de guía. Sin embargo, puede usarlas si lo desea.

2210-0027



© International Baccalaureate Organization 2010

*Напішыце каментарый да **аднаго** з наступных тэкстаў.*

**1.**

Нават пасля таго, як галоўны ўрач горада, яе равеснік, з валасамі колеру “спелы каштан”, фарбаванымі, ці што, і надзіва дагледжанымі пазногцямі раздражнёна патлумачыў, што ён асабіста ні пры чым, што абласная фармацыя ўзяла дый спыніла пастаўкі таго прэпарата ў горад, бо ўсяго на ўсіх, зразумела, не хапае (“Вы ж бачыце – эканоміка ў заняпадзе, дык адкуль у бюджэце возьмуцца грошы?” – гучна ўшчуваў ён яе, маўкліва-прыніжаную, як калісьці сама яна, у сваю бытнасць выкладчыцай, ушчувала занадта жвавых шкаляроў), – вопытны маніпулятар, ён дабіўся-такі свайго: на момант яна сапраўды адчула сорам, быццам бы прыйшла патрабаваць для сябе нейкіх незаконных ільгот, – так, нават пасля таго, як гэты заклапочаны сваёй знешнасцю дзеяч, дэманструючы танюткую скуру імпартнага пінжака, тэатральна развёў рукамі – маўляў, нічым не магу дапамагчы, – яна не здагадалася яшчэ пра энтрапію. Тысячу разоў (а мо і болей – ніхто не лічыў) даводзіла яна “прасунутым” вучням фізіка-матэматычнага каледжа другі пачатак тэрмадынамікі, шпарка пісала на класнай дошцы формулу, ажно крэйда крышылася пад ейнымі ўпэўненымі пальцамі, – але ў тым кабінеце з рознымі там факсамі-шмаксамі ну проста-такі разгубілася, як дзяўчынка, і думка пра энтрапію, з’явіся яна ў той момант, паказалася б ёй, пэўна, недарэчнай. Ды і што, скажыце, калі ласка, была ёй за справа да астывання любых сістэм,… яе ў той момант хвалявала толькі ўласная смерць, якая не прымусіць сабе доўга чакаць, калі былая настаўніца фізікі, а цяпер пенсіянерка Валянціна Валовіч не здабудзе тое, за чым прыйшла. І таму, узгадаўшы, як галоўурач зарульваў на шыкоўнай “таёце” ува двор, поўны ўшчэнт дабітых машын “хуткай дапамогі”, яна авалодала голасам і даволі цвёрда запыталася, колькі ёй яшчэ чакаць. “Не ведаю. Купляйце прэпарат ў Мінску.” – “Але ж у мяне даволі сціплая пенсія.” – “Ну, пазавіхайцеся як-небудзь! – разнервавана павысіў голас лекар. – Дарэчы, вы не адна такая, каля трохсот жанчын у горадзе маюць патрэбу ў гэтым лякарстве!”

Бяссоннай ноччу, уталопіўшыся ў каменны калодзеж двара, – прыглушана-блакітнае святло ў акне дома насупраць нагадвала акно працэдурнага пакоя ў анкалагічным стацыянары, дзе штоночы сінелі кварцавыя лямпы, – яна намагалася зразумець, чаму ў бюджэце няма грошай, калі з восені кватплата ўзляцела проста-такі да астранамічных велічыняў. Прыкладам, за сваю двухпакаёвую ёй даводзіцца выкладваць цяпер аж пяцьдзесят шэсць тысяч “бээр”. Метастазаў у яе, дзякуй Богу, не выявілася, таму і льгот па кватплаце няма ніякіх: сярод анкалагічна хворых тымі льготамі прадбачліва надзяляюць толькі паміраючых. “Ты ўсё сядзіш, Валянціна, а я вось суб-сі-ды-ю сабе выбегала,” – пахвалілася суседка, таксама пенсіянерка. Звярнулася была і яна за той субсідыяй: “Вось калі б пенсія ў вас на восем тысяч менш... ды кватэра аднапакаёвая...” – прабляялі ў домакіраўніцтве, і яна не стала спрачацца, пайшла сабе, здзіўляючыся ўжо чыста прафесійна, якая моцная ўсё ж такі рэч – магніт бюракратызму, і якое шырокае ён вакол сабе стварае поле, скрыўляючы ўсё прамое адпаведна сваім магнітным лініям, што не маюць ні пачатку, ні канца. Пасля аплаты “камуналкі” у яе заставалася пяцьдзесят тысяч. Жыць было можна (ела яна, што тая птушка, вопратку перашывала), нават сыну дапамагаць. Вядома, пакуль тамаксіфен быў бясплатны...

Тыя таблетачкі пры выпісцы са стацыянара малады, але ўжо змардаваны канвеерам бяды хірург, якому яна, саромеючыся, сунула дзесяць даляраў “на развіццё навукі”, загадаў ёй ужываць на працягу пяці год пасля аперацыі, не прапускаючы ніводнага прыёму з абавязковага курса… І яна, думаючы, вядома ж, пра сына – бо толькі дзеля свайго хлопчыка і змагалася за жыццё! – з добрасумленнасцю савецкага педагога штодня прынімала лякарства. Але неўзабаве тамаксіфен знік з усіх аптэк райцэнтра, і льготныя яе рэцэпты (нядоўга радавалася, што хоць гэта – бясплатна) ператварыліся ў бескарысныя паперкі з круглымі пячаткамі. Няўжо тры сотні яе зямлячак, скрушна думала Валянціна, многім з якіх яшчэ “паднімаць” дзяцей (з усіх яе таварышак па анкалагічнай палаце толькі яна мела дарослага сына), – дык няўжо ж нас, гаротніц, проста кінулі?! – слоўка, дарэчы, з лексікону яе ўнучкі і, як ўсе тыя моўныя “эксцэнтрызмы”, пульсуюча-гарачае, жывое. Бо ўнутры мовы таксама адбываліся нейкія незваротныя працэсы (узрастанне энтрапіі, няйнакш, але гэта яна зразумее пазней, значна пазней): асобныя словы астывалі, ператвараліся ў мёртвыя абалонкі-шкарлупіны, унутры якіх – пустата, нішто.

Алена Брава, *Змяя, пакрытая пёрамі птушкі сонца*, in *Камендацкі час для ластавак: аповесці, апавяданні*, Мінск (2004)

– Як Валянціна рэагуе на сытуацыю, у якой яна апынулася?

– Што мы даведваемся пра сучаснае грамадства з гэтага ўрыўка?

– Патлумачце, якім чынам аўтарка выкарыстоўвае сродкі мовы, каб выказаць галоўныя матывы ўрыўку.

**2.**

Гады навалiлiся, нервы патрэпаны,
I нейчая злосць б’е балюча пад рэбры.
I будзеш ты думаць: каму ты патрэбны?
I будзеш ты думаць: цi ўсе нам патрэбны?

Нiдзе нi агню, нi зарнiцы не бачу.
Вiдаць, цiшыню я не перакрычу.
I што вам з таго, што я часам заплачу,
I што вам з таго, што я зарагачу.

А моладзь да нас, франтавых, не падобна.
А як iм духоўнасць улiць у душу?
А можа я сам – дыназаўр дапатопны –
Не вартыя моладзi вершы пiшу?

Iм пляваць на нашы званнi i нiкчэмныя вянкi:
Па свайму ў iх распiсанню
Адыходзяць цягнiкi.

Яны не спазналi крывавасцi лютай.
Што ўхопiш – тваё, што адрэжаш – з’ясi.
Iх Бог – тэлевiзар, касеты, камп’ютэр...
А можа, яны не такiя зусiм?

Хоць век спажывецкi,
Ды справа не ў часе:
Глынуць i яны чад iнакшых баёў.
Каб мне загадалi:
Жывi, далучайся! –
Жыццё зноў пражыў бы я толькi сваё.

Пiмен Панчанка, *Агледзiны*, Мiнск (1998)

– Чаму, на вашу думку, паэт ужывае слова “злосць” у другiм радку? Што гэта за злосць? Супраць каго альбо чаго?

– Як вы разумееце радкi 5–8 ў агульным кантэксце верша?

– Што можна сказаць пра тое, якiм чынам рыфма i рытм выкарыстоўваюцца ў гэтым вершы?